КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
_______________ А.І.Жук
"___" ________ 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-2-07 вуч.

# ТЭКСТ. ЧУЖАЯ МОВА. ПУНКТУАЦЫЯ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура;**
**1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура.**
**Замежная мова (з указаннем мовы)**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, (20.04.2022, №85), АСВА 1-02 03 03-2021, (20.04.2022, №85), вучэбных планаў спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура (15.07.2021, №048 – 2021/у; 23.06.2022, №133 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (15.07.2021, №050 – 2021/у;23.06.2022, №134 – 2022/у); 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (15.07.2021, №051 – 2021/у; 23.06.2022, №135 – 2022/у)

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Н.А.Радзіваноўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В.В.Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
М.Р.Прыгодзіч, прафесар кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;
А.П.Жыганава, дацэнт кафедры беларускай і зарубежнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 18 г. Мінска імя І.С.Міранкова» ____________ М.У.Мінкевіч

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 10 ад 23.05.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 8 ад 18.06. 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” прызначана для студэнтаў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (спецыяльнасці 1-02 03 01 “Беларуская мова і літаратура”; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), з’яўляецца дысцыплінай модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” і ўваходзіць у сістэму лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў 4 курса філалагічнага факультэта.

Курс “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”, у якім раскрываюцца асноўныя заканамернасці сінхроннага развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы і які выконвае асноўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. Гэтым вызначаюцца мэта і задачы курса.

**Асноўная мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў; сфарміраваць установкі на практычнае прымяненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці; падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для выкладання беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы вывучэння дысцыпліны**:

– даць грунтоўныя веды аб разнастайных моўных з’явах;

– выпрацаваць навуковыя погляды на сістэму мовы на сінтаксічным узроўні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове;

– удасканаліць навыкі беларускага вуснага і пісьмовага маўлення;

– выпрацаваць грунтоўныя ўменні і навыкі самастойнага лінгвістычнага аналізу моўных адзінак, з’яў і фактаў.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй*

Вучэбная дысцыпліна “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” адносіцца да цыкла вучэбных дысцыплін дзяржаўнага кампанента, з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” і вывучаецца на працягу восьмага семестра.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі*

Вучэбная дысцыпліна “Сучасная беларуская літаратурная мова” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Стылістыка”, а таксама са школьным курсам беларускай мовы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт **павінен**:

**ведаць**:

– сістэму сучаснай беларускай літаратурнай мовы на сінтаксічным узроўні;

– лінгвістычную тэрміналогію;

– літаратурныя нормы (сінтаксічныя, пунктуацыйныя) сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– прынцыпы і правілы беларускага правапісу;

**умець:**

– адбіраць, сістэматызаваць і правільна кваліфікаваць моўныя факты;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– выконваць пунктуацыйны аналіз;

– заўважаць і выпраўляць граматычныя і пунктуацыйныя памылкі;

**валодаць**:

– сінтаксічнымі і пунктуацыйнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– навыкамі лінгвістычнага моўнага разбору на сінтаксічным і пунктуацыйным узроўні моўнай сістэмы;

– навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў базавай прафесійнай кампетэнцыі. Для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура **БПК 22**: Выкарыстоўваць моўную сістэму ў сінхраніі, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні на практыцы, для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) **ПК 19**: Выкарыстоўваць моўную сістэму ў сінхраніі, заканамернасці і правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні на практыцы.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

**Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.**

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу курса пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы). Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Вучэбная дысцыпліна на дзённым аддзяленні чытаецца на 4 курсе ў 8-ым семестры. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” адводзіцца 116 вучэбных гадзін, з якіх 56 – аўдыторныя (28 гадзін лекцыйных і 28 гадзін практычных заняткаў), самастойная работа 60 гадзін.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

***Размеркаванне гадзін у семестры***:

| семестр | усяго гадзін | аўды-торныя | лекцыі | прак-тычныя | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | 116 | 56 | 28 | 28 | 60 | экзамен |

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы ў 8 семестры: тэма 1 "Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы" – рэйтынгавая кантрольная работа № 1; тэма 3.2. "Асноўныя правілы пастаноўкі знакаў прыпынку" – рэйтынгавая кантрольная работа № 2.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### 1. АСНОЎНЫЯ АДЗІНКІ І ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ЗВЯЗНАЙ МОВЫ

**1.1 Тэкст і складаныя формы звязнай мовы**.

Тэкст як аб’ект лінгвістыкі. Напрамкі даследавання тэксту. Розныя падыходы да вызначэння паняцця тэксту. Камунікацыйная і структурная цэласнасць тэксту. Праблема класіфікацыі тэкстаў.

Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне).

Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы.

Перыяд, яго структура, сродкі сувязі частак. Праблема тыпалогіі перыядаў у лінгвістычнай літаратуры. Знакі прыпынку ў перыядзе.

Складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства) як адна з формаў звязнай мовы. Паслядоўная, паралельная і змешаная сувязь сказаў у складаным сінтаксічным цэлым. Сродкі сувязі (аб’яднання) сказаў у звышфразавых адзінствах. Рэматычныя дамінанты мікратэктаў.

Абзац як сродак структурнай і сэнсавай арганізацыі тэксту. Функцыі абзаца (сэнсавая, эмацыйная, кампазіцыйная, выдзяляльная). Складанае сінтаксічнае цэлае і абзац.

Стылістычная роля складаных формаў звязнай мовы (перыяда, складанага сінтаксічнага цэлага, абзаца).

Аналіз складаных формаў звязнай мовы.

### 2. ЧУЖАЯ МОВА. ЦЫТАТЫ

**2.1 Паняцце чужой мовы.** Асноўныя спосабы перадачы чужой мовы: простая (прамая), няўласна-простая і ўскосная мова. Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы, сродкі сувязі гэтых частак. Структурныя разнавіднасці простай мовы: маналог, дыялог, палілог; уключаная простая мова і інш. Правілы замены простай мовы ўскоснаю. Няўласна-простая мова як адначленная канструкцыя, яе сінтаксічная і стылістычная роля. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

Аналіз тэксту з чужой мовай.

Цытаты. Правілы афармлення цытат.

### 3. ПУНКТУАЦЫЯ

**3.1 Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку.** Сувязь пунктуацыі з сінтаксісам. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы.

З гісторыі пунктуацыі. Станаўленне і развіццё беларускай пунктуацыі. Аспекты даследавання пунктуацыі ў беларускай мове.

Асновы пунктуацыі (сэнсавая, граматычная, інтанацыйная). Розныя падыходы да вызначэння асноў пунктуацыі.

Праблема класіфікацыі знакаў прыпынку. Розныя падыходы да падзелу знакаў прыпынку.

Віды знакаў прыпынку (раздзяляльныя, выдзяляльныя). Спалучэнне знакаў прыпынку (коска і працяжнік, дужкі і коска, пытальнік і клічнік і інш.). Нарматыўныя знакі прыпынку. Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку. Аўтарскія знакі прыпынку.

Стылістычная роля знакаў прыпынку. Новыя сінтаксічныя з'явы і пунктуацыя.

**3.2 Асноўныя правілы пастаноўкі знакаў прыпынку.**

Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў канцы сказа. Правілы пастаноўкі кропкі. Правілы пастаноўкі пытальніка. Правілы пастаноўкі клічніка. Правілы пастаноўкі шматкроп'я.

Правілы пастаноўкі коскі ў простым сказе. Коска паміж аднароднымі членамі сказа. Коска пры параўнальных зваротах. Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах. Коска пры адасобленых акалічнаснях і акалічнасных зваротах. Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іных слоў у сказе. Коска пры пабочных і ўстаўных канструкцыях. Коска пры звароткy. Коска пры выкоічніках і гукаперайманнях. Коска пры сцявярджаных, адмоўных і пытальных словах.

Правілы пастаноўкі коскі ў складаным сказе. Правілы пастаноўкі коскі ў складаназлучаным сказе. Правілы пастаноўкі коскі ў бяззлучнікавым сказе. Правілы пастаноўкі коскі ў складаназалежным сказе.

Правілы пастаноўкі кропкі з коскай.

Правілы пастаноўкі двукроп'я.

Правілы пастаноўкі працяжніка.

Правілы пастаноўкі дужак.

Правілы пастаноўкі двукосся.

Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку і двукосся пры простай мове і цытатах.

Правілы пастаноўкі спалучэнняў знакаў прыпынку.

Правілы паслядоўнасці знакаў прыпынку пры спасылках.

**3.3 Пунктуацыйны аналіз.**

Аналіз пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе або тэксце.

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | | | |
| **ТЭКСТ. ЧУЖАЯ МОВА. ПУНКТУАЦЫЯ** | | **28** | **28** | **60** | | |
| **1.** | **Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы** | **10** | **6** | **16** | | |
| **1.1** | 1. Тэкст і складаныя формы звязнай мовы.<br>2. Розныя падыходы да вызначэння паняцця тэксту.<br>3. Тэкст як аб’ект лінгвістыкі.<br>4. Напрамкі даследавання тэксту.<br>5. Камунікацыйная і структурная цэласнасць тэксту. | 2 | | | 3, дад. 4, 7 | |
| | 1. Праблема класіфікацыі тэкстаў.<br>2. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне). | 2 | | 4 | 3, дад. 4, 7 | |
| | 1. Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы.<br>2. Перыяд, яго структура, сродкі сувязі частак.<br>3. Праблема тыпалогіі перыядаў у лінгвістычнай літаратуры.<br>4. Знакі прыпынку ў перыядзе. | 2 | | 4 | 3, дад. 4, 7 | |
| | 1. Складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства) як адна з формаў звязнай мовы. | 2 | | 6 | 3, дад. 4, 7 | |
| | 1. Паслядоўная, паралельная і змешаная сувязь сказаў у складаным сінтаксічным цэлым.<br>2. Сродкі сувязі (аб’яднання) сказаў у звышфразавых адзінствах.<br>3. Рэматычныя дамінанты мікратэкстаў. | | 2 | | 3, дад. 4, 7 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | 1. Аналіз складанага сінтаксічнага цэлага. | | 2 | | 3, дад. 4, 7 | Ушчыльненае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | 1. Абзац як сродак структурнай і сэнсавай арганізацыі тэксту.<br>2. Функцыі абзаца (сэнсавая, эмацыйная, кампазіцыйная, выдзяляльная).<br>3. Складанае сінтаксічнае цэлае і абзац. | 2 | | 2 | 3, дад. 4, 7 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Стылістычная роля складаных формаў звязнай мовы (перыяда, складанага сінтаксічнага цэлага, абзаца).<br>2. Аналіз складаных формаў звязнай мовы.<br>3. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы ” | | 2 | | 3, дад. 4, 7 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 па тэме 1. |
| **2** | **Чужая мова. Цытаты** | **2** | **4** | **12** | | |
| **2.1** | 1. Паняцце чужой мовы. Асноўныя спосабы перадачы чужой мовы: простая (прамая), няўласна-простая і ўскосная мова.<br>2. Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы, сродкі сувязі гэтых частак.<br>3. Структурныя разнавіднасці простай мовы: маналог, дыялог, палілог; уключаная простая мова і інш.<br>4. Няўласна-простая мова як адначленная канструкцыя, яе сінтаксічная і стылістычная роля. | 2 | | 2<br>6 | 2, 3, дад. 1, 5,7, 8 | |
| | 1. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.<br>2. Цытаты. | | 2 | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 5,7, 8 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | 1. Правілы замены простай мовы ўскоснаю.<br>2. Аналіз тэксту з чужой мовай. | | 2 | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 5,7, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| **3.** | **Пунктуацыя** | **16** | **18** | **32** | | |
| **3.1** | 1. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку.<br>2. Сувязь пунктуацыі з сінтаксісам.<br>3. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы | 2 | | 2 | 3, дад. 7, 8 | |
| | 1. З гісторыі пунктуацыі.<br>2. Станаўленне і развіццё беларускай пунктуацыі.<br>3.Аспекты даследавання пунктуацыі ў беларускай мове. | 2 | | 6 | 3, дад. 7 | |
| | 1. Асновы пунктуацыі (сэнсавая, граматычная, інтанацыйная).<br>2. Розныя падыходы да вызначэння асноў пунктуацыі.<br>3. Праблема класіфікацыі знакаў прыпынку. Розныя падыходы да падзелу знакаў прыпынку.<br>4. Віды знакаў прыпынку (раздзяляльныя, выдзяляльныя).<br>5. Спалучэнне знакаў прыпынку (коска і працяжнік, дужкі і коска, пытальнік і клічнік і інш.). | 2 | | 2 | 3, дад. 7, 8 | |
| | 1. Нарматыўныя знакі прыпынку.<br>2. Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку.<br>3. Аўтарскія знакі прыпынку. | 2 | | 6 | 3, дад. 7, 8 | |
| | 1. Стылістычная роля знакаў прыпынку.<br>2. Новыя сінтаксічныя з’явы і пунктуацыя. | 2 | | | 3, дад. 7, 8 | |
| **3.2.** | **Асноўныя правілы пастаноўкі знакаў прыпынку** | | | | | |
| | 1. Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў канцы сказа. | 2 | | | 1, 2, дад. 3, | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 6, 8 | |
| | 1. Правілы пастаноўкі кропкі.<br>2. Правілы пастаноўкі пытальніка.<br>3. Правілы пастаноўкі клічніка.<br>4. Правілы пастаноўкі шматкроп’я. | | 2 | | 1, 2, дад.3, 6, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | 1. Правілы пастаноўкі коскі ў простым сказе. | 2 | | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | |
| | 1. Коска паміж аднароднымі членамі сказа.<br>2. Коска пры параўнальных зваротах. | | 2 | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | 1. Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах.<br>2. Коска пры адасобленых акалічнаснях і акалічнасных зваротах. | | 2 | 2<br>4 | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | 1. Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іных слоў у сказе.<br>2. Коска пры пабочных і ўстаўных канструкцыях. | | 2 | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Ушчыльненае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | 1. Коска пры зваротку.<br>2. Коска пры выклічніках і гукаперайманнях.<br>3. Коска пры сцвярджальных, адмоўных і пытальных словах. | | 2 | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае апытванне. |
| | 1. Правілы пастаноўкі коскі ў складаным сказе. | 2 | | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | |
| | 1. Коска ў складаназлужаным сказе.<br>2. Коска ў бяззлучнікавым сказе.<br>3. Коска ў складаназалежным сказе.<br>4. Правілы пастаноўкі кропкі з коскай. | | 2 | | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | 1. Правілы пастаноўкі двукроп’я.<br>2. Правілы пастаноўкі працяжніка. | | 2 | 6 | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| | 1. Правілы пастаноўкі дужак.<br>2. Правілы пастаноўкі двукосся.<br>3. Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку і двукосся пры простай мове і цытатах.<br>4. Правілы пастаноўкі спалучэнняў знакаў прыпынку.<br>5. Правілы паслядоўнасці знакаў прыпынку пры спасылках. | | 2 | 4 | 1, 2, дад. 3, 6, 8 | Праверка выкананых практыкаванняў. Франтальнае апытванне. |
| **3.** | **Пунктуацыйны аналіз.** | | **2** | | | |
| | Аналіз пастаноўкі знакаўпрыпынку ў сказе або тэксце. | | 2 | | 1, 2, дад.3,6, 8 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 па тэме 3.2. |
| | ***Усяго ў 8 семестры: 116 г.*** | ***28*** | ***28*** | ***60*** | | ***Экзамен*** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Практыкум [Электронны рэсурс] : вучэб. дапам. / І. Л. Бурак [і інш.] ; навук. рэд. І. Л. Бурак // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/4320. – Дата доступу: 16.04.2024.

2. Сучасная беларуская літаратурная мова [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова» / склад.: Н. П. Лобань, В. В. Урбан, С. С. Мароз // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/44203. – Дата доступу: 16.04.2024.

3. Сучасная беларуская літаратурная мова : падручнік / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2024. – 591 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2007–2009. – Ч. 2 : Сінтаксіс. – 2009. – 240 с.

2. Плотнікаў, Б. А. Беларуская мова : лінгвіст. кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк ; адк. рэд. Т. Я. Кузьміна. – Мінск : Кн. дом : Інтэрпрэссэрвіс, 2003. – 672 с.

3. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 142 с.

4. Рамза, Т. Р. Сінтаксіс. Тэарэтычны курс : вучэб. дапам. для ВНУ па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» / Т. Р. Рамза ; пад агул. рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – 202 с.

5. Сучасная беларуская літаратурная мова: тэсты для тэматычнага кантролю : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / аўт.-склад.: А. І. Калечыц [і інш.] ; пад рэд. П. А. Міхайлава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2006. – 280 с.

6. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. / В. У. Азарка [і інш.] ; пад рэд. А. С. Васілеўскай. – 2-е выд., выпрац. – Мінск : Рэсп. ін-т праф. адукацыі, 2022. – 383 с.

7. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2009– . – Т. 7 : Беларуская мова / пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. – 2017. – 495 с.

8. Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы : падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на дадзеную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных работ;

– выкананне кантрольных работ, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых работ;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі;

– азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;
– калёквіумы;
– канферэнцыі;
– залікі па тэмах / раздзелах;
– тэсціраванне;
– кантрольныя работы;
– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойнай працы, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;
– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;
– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;
– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;
– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная праца студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай працы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні задання. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіхназіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. 1. | Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне). | 4 | Выпісаць з тэкстаў мастацкай літаратуры па два прыкдады тэкстаў розных тыпаў. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Перыяд, яго структура, сродкі сувязі частак. | 4 | Выпісаць з тэкстаў мастацкай літаратуры прыкдады перыяду. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства) як адна з формаў звязнай мовы. | 6 | Выпісаць з тэкстаў мастацкай літаратуры прыкдады ЗФА з рознымі відамі сувязі. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Абзац як сродак структурнай і сэнсавай арганізацыі тэксту. Функцыі абзаца (сэнсавая, эмацыйная, кампазіцыйная, выдзяляльная). | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 170 // Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум : вучэб. дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск : БДПУ, 2005. – 187с. | Практыка-ванне |
| 2.1. | Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы, сродкі сувязі гэтых частак | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 138 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с. | Практыка-ванне |
| | Структурныя разнавіднасці простай мовы: маналог, дыялог, палілог; уключаная простая мова і інш | 6 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 165 // Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум : вучэб. дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск : БДПУ, 2005. – 187с. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Правілы замены простай мовы ўскоснаю. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 162 // Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум : вучэб. дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск : БДПУ, 2005. – 187с. | Практыка-ванне |
| | Цытаты. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 143 // Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с. | Практыка-ванне |
| 3.1. | Роля пунктуацыі ў | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне | Практыка- |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | афармленні пісьмовай мовы. | | № 144 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с | ванне. |
| | З гісторыі пунктуацыі | 6 | Падрыхтаваць прэзентацыю “З гісторыі пунктуацыі”, выкарыстаць матэрыял вучэбнага дапаможніка (Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.]; пад рэд. Д.В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2017. – 588 с.). | Прэзента-цыя. |
| 3.2. | Спалучэнне знакаў прыпынку (коска і працяжнік, дужкі і коска, пытальнік і клічнік і г.д). | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 161 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с | Практыка-ванне. |
| | Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку. Аўтарскія знакі прыпынку. | 6 | Выпісаць з тэкстаў мастацкай літаратуры прыкдады сказаў з варыянтнымі і факультатыўнымі, аўтарскімі знакамі прыпынку. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 77 // Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум : вучэб. дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск : БДПУ, 2005. – 187с. | Практыка-ванне. |
| | Коска пры адасобленых акалічнаснях і акалічнасных зваротах. | 4 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 93, 96 // Сінтаксіс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: практыкум : вучэб. дапам. / І.Л. Бурак, С.С. Мароз, П.А. Міхайлаў, М.С. Ржавуцкая, Н.У. Чайка; навук. рэд. І.Л. Бурак. – Мінск : БДПУ, 2005. – 187с. | Практыка-ванні. |
| | Правілы пастаноўкі працяжніка. | 6 | Выпісаць з мастацкіх тэкстаў сказы, дзе адлюстраваны ўсе пазіцыі пастаноўкі працяжніка ў простым і складаным сказе. | Картатэка моўных фактаў. |
| | Правілы пастаноўкі знакаў прыпынку і двукосся пры простай мове і цытатах. | 4 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 143, 144 // Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с | Практыка-ванні. |
| | ВСЕГО: | 60 | | |

## ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

### Рэйтынгавая кантрольная работа № 1

*Тэма* 1.1

*Заданні:*

1. Прааналізуйце ССЦ па наступнай схеме: *а) структура (колькасць абзацаў, суадносіны абзацаў і структурных частак); б) сродкі міжфразавай сувязі: лексічныя (лексічныя паўторы, словы адной ПТГ ці ЛСГ, тыпы сінонімаў і антонімаў і інш.); лексіка-граматычныя (займеннікавыя словы, дамінаванне пэўнай часціны мовы, наяўнасць злучнікаў, пабочна-мадальных слоў, парадыгма дзеясловаўвыказнікаў і інш.); уласна сінтаксічныя (парадак слоў, непаўната сказаў, сінтаксічны паралелізм); в) разнавіднасць міжфразавай сувязі (ланцужковая, паралельная, змешаная, далучальная); г) функцыянальна-сэнсавы тып тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне); д) функцыі абзацаў (кампазіцыйная, выдзяляльная, сэнсавая, эмацыйная).*

2. Прааналізуйце перыяд па наступнай схеме: *а) структура (просты сказ, ускладнены аднароднымі членамі сказа, адасобленымі членамі, пабочнымі канструкцыямі і інш.; складаназалежны сказ ускладненай будовы, складаназлучаны сказ, бяззлучнікавы складаны сказ, складаны сказ з рознымі відамі сувязі); б) тып перыяду паводле кампазіцыйнай арганізацыі (перыяд са сферычнай сіметрыяй, акаймаваны перыяд, перыяд з сустрэчным павышэннем і інш.); в) сродкі сувязі частак (паралелізм канструкцый, лексічныя паўторы, трывальна-часавыя суадносіны дзеясловаў-выказнікаў і інш.); г) разнавіднасць перыяду паводле тыпу маўлення (апісанне, апавяданне, разважанне).*

3. Ахарактарызуйце перыяд як складаны сказ: *а) вызначце тып сказа, б) сэнсавыя адносіны паміж часткамі, в) тыпы дададных частак, г) сродкі сувязі частак. Пабудуйце схему.*

**I.** Ёсць штосьць незвычайна прыгожае ў гэтых прывольных старасвецкіх шляхах Беларусі. Шырока і размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі, ад мястэчак да гарадоў, злучаючы паветы, губерні і цэлыя краіны. Колькі хараства і чароўнага прывабу ў сініх іх далях! Колькі новых малюнкаў, свежых матываў і таемных здарэнняў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага! З якой незвычайнай сілай парываюць яны да сябе і як моцна дакранаюцца да струн душы! Якая ж сіла заложана ў гэтых прасторах неабнімных родных шляхоў і якую ўладу маюць яны над табою, неспакойны, вечна заклапочаны падарожны? Ці не гэта, нікім не выказаная казка іх, якая складалася доўгімі вякамі і запісвалася агнявымі літарамі людскае крыўды ў сэрцах мільёнаў падарожных, што ішлі і ехалі па гэтых шляхах і думалі свае думкі? Ці не ён, гэты летапіс часаў, так глыбока западае ў тваю душу, каб адбіцца ў ёй, знайсці свой пэўны вобраз і форму і грознаю маланкаю жахнуць цёмную ноч няволі, што звісла над краем? А можа, гэта таемная і страшная бясконцасць блукання па свеце, дзе трудна вызначыць пачатак і канец, сімваламі якіх з'яўляюцца гэтыя шляхі, авявае душу тваю невыразным хваляваннем і кліча яе зліцца з бяскрайнасцю зямлі? Ці то – няясны адбітак вечнага нездавалення людскога, таемны покліч да

шукання іншых форм жыцця, несвядомае імкненне да лепшае долі? Ці то – парыванне душы разбіць нейкія граніцы і вырвацца на бязмежныя прасторы яшчэ нідзе неіснуючай волі?

Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі, назбіраныя і напісаныя часамі на камлях вашых прысад? (Якуб Колас. "На ростанях").

**ІІ.** Ці ў ясны дзень, ці непагодным днём, ці ў час, калі вясна наўсцяж спявае, ці той парою, калі зноў агнём, агнём іскрыцца павуціна; ці зелянее руні аксаміт; ці жораў крык нясе, як сірація, закінуты ў нябёсах паміж хмар; ці звоняць росы ранку пад нагамі; ці ззяе з вышыні маяк-стажар над любымі рачнымі берагамі, – заўжды, заўжды, усюды, у кожны міг, з жыццём усім, з якім навечна ў згодзе, ад самых шчырых роздумаў сваіх мне пакланіцца хочацца прыродзе! (Кастусь Кірэенка. "Прырода").

**Рэйтынгавая кантрольная работа № 2**

*Тэма* 3.1

*Заданні:*

1. Запішыце тэкст пад дыктоўку.

2. Зрабіце пунктуацыйны аналіз выдзеленых сказаў (у адпаведнасці з парадкам разбору).

Лета развітвалася, пачыналася восень; у цудоўным парку вакол дамочка для гасцей, дзе пасяліўся Жукоўскі, і вакол палаца было больш летняй зяляніны, як восеньскага золата, дні стаялі пагодлівыя, і ад сонца праз высокія вокны ды адчыненыя ў парк дзверы пазалотай палалі шыкоўныя інтэр'еры пакояў.

*Светлы настрой напоўніў сэрца мастака, і ён адразу ўзяўся за работу, пісаў, перадаючы на палотнах непасрэднае ўражанне ад сустрэчы з цудоўнымі куточкамі шчаслівага людскога жыцця.* **[1 варыянт]** *Ён адчыняў усе вокны і дзверы, пускаў у пакоі жывую прыроду і смела, энергічна клаў на палатно, здавалася, не фарбу, а само расплаўленае сонца.* **[2 варыянт]**. Ім саграваў і мэблю з чырвонага дрэва ды карэльскай бярозы, і партрэтныя вобразы баявых, у генеральскіх эпалетах і ордэнскіх стужках, продкаў, акаймаваных багетным золатам, і серабрысты, у залатой аправе, крышталь люстраў ды вазаў з кветкамі таго самага парку, водар якога поўніў пакоі духмянасцю жывой прыроды.

Тут усё было музыкай, якую ён перадаваў рухам каляровых рэфлексаў, карункаў, валёраў, блікаў. Музыка жыла і ў самой графіні, жанчыне надзвычай прыгожай і далікатнай, і ў былым жыцці, якое ведалі людзі, што прысутнічалі ў палацы на партрэтах. Настроі палаца зрабіліся настроямі мастака, і ён адчуваў іх у кожнай рэчы, у кожнай дэталі. Як і ў квяцістым шалі, кінутым, быццам выпадкова, на белае крэсла, як і ў чырвоных кветках па чорным полі, так гарманіраваў са смуглявым, нібы ў цыганкі, абліччам графіні. А за крэслам з шалем – дзверы, адчыненыя ў парк: толькі што графіня выйшла з пакоя, не зачыніўшы іх за сабою, і ў светлых мазочках пэндзля па заценёнай падлозе

яшчэ як быццам калыхалася паветра, узнятае доўгай і шырокай спадніцаю. Тут ужо і назва карціны "Пакой у маёнтку Брасава" прасіла большага напаўнення – "Пакой графіні Наталлі Сяргееўны" (270 слоў).

Віктар Карамазаў. "Краса і воля".

**Парадак пунктуацыйнага аналізу сказа**

1. Падкрэсліць знакі прыпынку ў сказе.

2. Вызначыць тып сказа паводле мэты паведамлення (апавядальны, пытальны, пабуджальны) і інтанацыі (клічны, няклічны). Патлумачыць знак прыпынку ў канцы сказа.

3. Назваць тып сказа паводле структуры: просты (ускладнены ці няўскладнены) ці складаны (складаназлучаны, бяззлучнікавы, складаназалежны, складаназалежны з некалькімі даданымі часткамі, складаны сказ з рознымі відамі сувязі).

3.1. Для простага ўскладненага сказа: а) назваць кампаненты ўскладнення, патлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку, б) указаць разнавіднасці знака прыпынку паводле функцыі – раздзяляльны, выдзяляльны, поліфункцыянальны; паводле рэгламентаванасці – рэгламентаваны (нарматыўны, варыянтны, факультатыўны), нерэгламентаваны (аўтарскі).

3.2. Для складанага сказа: а) назваць прэдыкатыўныя часткі сказа, б) вызначыць сувязь і адносіны паміж часткамі; в) патлумачыць пастаноўку знака прыпынку паміж прэдыкатыўнымі часткамі; г) указаць разнавіднасці знака прыпынку паводле функцыі – раздзяляльны, выдзяляльны, поліфункцыянальны; паводле рэгламентаванасці – рэгламентаваны (нарматыўны, варыянтны, факультатыўны), нерэгламентаваны (аўтарскі); д) назваць кампаненты ўскладнення ў межах прэдыкатыўнай часткі складанага сказа (калі ёсць), патлумачыць пастаноўку знака прыпынку, е) указаць разнавіднасці знака прыпынку паводле функцыі – раздзяляльны, выдзяляльны, поліфункцыянальны; паводле рэгламентаванасці – рэгламентаваны (нарматыўны, варыянтны, факультатыўны), нерэгламентаваны (аўтарскі).

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦІПЛІНЫ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” (модуль “Сучасная беларуская літаратурная мова”) мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю выкарыстоўваецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” (модуль “Сучасная беларуская літаратурная мова”) вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ featured рознага віду. Пры падборы заданняў улічваецца аб’ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне “Тэкст. Чужая мова. Пунктуацыя” можа мець розныя формы, сярод якіх:

• вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, вусныя залікі і экзамены;

• пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены;

• графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);

• тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні. Рэкамендаваная выніковая форма кантролю – экзамен.

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “СІНТАКСІС (СКЛАДАНЫ СКАЗ)”

1. Тэкст як аб’ект лінгвістыкі. Напрамкі даследавання тэксту. Камунікацыйная і структурная цэласнасць тэксту. Розныя падыходы да вызначэння паняцця тэксту. Камунікацыйная і структурная цэласнасць тэксту.
2. Праблема класіфікацыі тэкстаў.
3. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне).
4. Перыяд, яго структура, сродкі сувязі частак. Знакі прыпынку ў перыядзе.
5. Праблема тыпалогіі перыядаў у лінгвістычнай літаратуры.
6. Складаныя формы звязанай мовы: перыяд, складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства), абзац. Стылістычная роля складаных формаў звязнай мовы.
7. Паслядоўная, паралельная і змешаная сувязь сказаў у складаным сінтаксічным цэлым. Сродкі аб’яднання сказаў у звышфразавых адзінствах.
8. Абзац як сродак структурнай і сэнсавай арганізацыі тэксту. Функцыі абзаца (сэнсавая, эмацыйная, кампазіцыйная).
9. Аналіз складаных формаў звязнай мовы.
10. Паняцце чужой мовы. Асноўныя спосабы перадачы чужой мовы: простая (прамая), няўласна-простая і ўскосная мова.
11. Сказ з простай мовай як двухчленная канструкцыя. Структура аўтарскага сказа і чужой мовы, сродкі сувязі гэтых частак.
12. Структурныя разнавіднасці простай мовы: маналог, дыялог, палілог; уключаная простая мова і інш. Правілы замены простай мовы ўскоснаю.
13. Няўласна-простая мова як адначленная канструкцыя, яе сінтаксічная і стылістычная роля.
14. Цытаты.
15. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку. Сувязь пунктуацыі з сінтаксісам. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы.
16. З гісторыі пунктуацыі. Станаўленне і развіццё беларускай пунктуацыі. Аспекты даследавання пунктуацыі ў беларускай мове.
17. Асновы пунктуацыі (сэнсавая, граматычная, інтанацыйная). Розныя падыходы да вызначэння асноў пунктуацыі.
18. Віды знакаў прыпынку (раздзяляльныя, выдзяляльныя). Спалучэнне знакаў прыпынку (коска і працяжнік, дужкі і коска, пытальнік і клічнік і інш.). Праблема класіфікацыі знакаў прыпынку. Розныя падыходы да падзелу знакаў прыпынку.
19. Нарматыўныя знакі прыпынку. Варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку. Аўтарскія знакі прыпынку.
20. Стылістычная роля знакаў прыпынку. Новыя сінтаксічныя з’явы і пунктуацыя.

21. Правілы пастаноўкі кропкі.
22. Правілы пастаноўкі пытальніка.
23. Правілы пастаноўкі клічніка.
24. Правілы пастаноўкі шматкроп’я.
25. Коска паміж аднароднымі членамі сказа.
26. Коска пры параўнальных зваротах.
27. Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах.
28. Коска пры адасобленых акалічнаснях і акалічнасных зваротах.
29. Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іных слоў у сказе.
30. Коска пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.
31. Коска пры зваротку.
32. Коска пры выклічніках і гукаперайманнях.
33. Коска пры сцявярджальных, адмоўных і пытальных словах.
34. Коска ў складаназлужаным сказе.
35. Коска ў бяззлучнікавым сказе.
36. Коска ў складаназалежным сказе.
37. Правілы пастаноўкі кропкі з коскай.
38. Правілы пастаноўкі двукроп’я.
39. Правілы пастаноўкі працяжніка.
40. Правілы пастаноўкі дужак.
41. Правілы пастаноўкі двукосся.
42. Правілы пасатноўкі знакаў прыпынку і двукосся пры простай мове і цытатах.
43. Правілы пастаноўкі спалучэнняў знакаў прыпынку.
44. Правілы паслядоўнасці знакаў прыпынку пры спасылках.

**ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ**
**Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне №1**

1. Прачытайце. Вызначце складанае сінтаксічнае цэлае ў тэксце.
2. Укажыце тып сувязі паміж сказамі ССЦ.
3. Назавіце сродкі, з дапамогай якіх створана складанае сінтаксічнае цэлае.

Люблю я ў цёмную ночку выйсці адзі на бераг возера, стаць на грэблі каля млына і прыгледзецца да хараства летняе ночы, прыслухацца да яе цішы. Круглы блішчасты месяц высока стаіць на небе і лье свій бледнаваты, маркотны свет на сонную зямлю і глядзіцца ў спакойнай вадзе возера. А гладкае, блішчастае возера люстрам ззяе на месяцы, і ціха, спакойна, чуць-чуць дрыжаць яго маршчынкі, маленькія хвалі, на бледным бляску месяца. Тысячы зорак любуюцца ў ім, дрыжаць, пераліваюцца, як каплі расы на ўсходзе сонца. Па краях возера разрасліся высокія балотныя травы: аер, чарот, асака. За імі чуць-чуць выразаюцца з цемнаты чорныя фігуры алешын і старых дуплістых верб. Роўны, спакойны, усю ноч несціхаючы шум вады, каторая сочыцца праз шчыліны заставаў, навявае пакой на душу. Стары млын з цяжкімі коламі, здаецца, заслухаўся шумам незлічоных капель і адзінока стаіць над вадою і блішчыць на месяцы сваімі маленькімі акенцамі, запыленымі мукою. Ціха. Толькі часамі плюхне рыбка, і маленькія хвалькі пабягуць адна за адною маленькімі абручыкамі і расплывуцца па возеры, не дайшоўшы да берагу… (Якуб Колас)

**Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне №2**

1. Прачытайце тэкст. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
2. Вызначце, якую функцыю выконваюць яны ў сказе.
3. Вызначце сказы, у якіх магчыма пастаноўка варыянтыных знакаў прыпынку.

Пачынала світаць. Далёкім святлом займаўся край неба, і навокал сталі відаць кусты і травы.

Ляўчук не ведаў, куды вёў яго лясны шлях, але ўсё бег і бег па альховых зарасніках. У малады шчыльны ельнік ён не палез, а абышоў яго збоку. Ён усё слухаў, хоць і без таго было чуваць, што яго даганялі: усю ноч ззаду пагрозліва брахалі сабакі.

З нязвыклай асцярогай ён нёс за пазухай маленькае цёплае цельца і думаў: “Хоць бы дзе напаткаць вёску, жанчын і аддаць ім малога”. Сам ён, як бы ні стараўся, не зможа ўратаваць гэта жыццё.

Ён хутка ішоў ускрайкам балота. Мяркуючы па ўсім, балота было немалое і цягнулася здалёку: ён ішоў ужо з гадзіну, а яно не канчалася.

Аднак Ляўчук спадзяваўся, што раней, чым немцы дагоняць яго, ён знойдзе добрых людзей і ўратуе малога. Ён вельмі хацеў збарагчы хлопчыка, з

нейкай невыразнай для сябе надзеяй ухапіўся за яго і не хацеў разлучацца. Усе, каго даручылі яму ў гэтай дарозе, адзін за адным загінулі, і застаўся толькі нікому невядомы, некім не бачаны безыменны малы. Ён стаў вельмі патрэбны партызану, бо нейкім чынам звязваў яго з усімі, каго не стала, і даваў абгрунтаванне яго пакутам, як апраўданне яго памылкам. У гэтай малечы цяпер заключаўся для яго сэнс жыцця, якім ён не мог пагарджаць, пакуль яшчэ быў жывы і заставаўся чалавекам. (В.Быкаў)

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| 1. Уводзіны ў мовазнаўства<br>2. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы<br>3. Стылістыка | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад __.__.2024 г.). |